Источник: "Мінская праўда" - 2014-06-03



# Дыпломы памяці

**Да 69-й гадавіны Вялікай Перамогі і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на базе гімназіі №174 Мінска адбылася 7-я міжнародная маладзёжная навукова-практычная канферэнцыя «Вялікая Айчынная вайна 1941—1945-х гадоў у гістарычнай памяці народа».**

Яе арганізатары — Інстытут гісторыі НАНБ, прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка, упраўленне адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска, гімназія №174. У рабоце дзесяці секцый удзельнічалі навучэнцы з Беларусі, Расіі, Казахстана, краін Балтыі.

Як паведамілі ў аддзеле адукацыі, спорту і турызму Чэрвеньскага райвыканкама, чатыры школьнікі гэтага рэгіёна ўпершыню ўдзельнічалі ў такім прадстаўнічым форуме. Трое з іх вярнуліся з узнагародамі. Журы адзначыла дыпломам першай ступені, выдадзеным Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, працу вучаніцы 10-га класа Валевачоўскай СШ Яны Аблавацкай (кіраўнік — Алена Макась), у якой школьніца распавяла пра ход вызвалення Чэрвеньскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, месцы аперацыі «Баграціён». Дыплом другой ступені атрымала вучаніца 11-га класа Лядзенскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Вольга Сёмкіна (кіраўнік — Георгій Бабіч), якая ў сваёй працы зрабіла падрабязны аналіз звестак аб загінулых у Вялікую Айчынную вайну на тэрыторыі Лядзенскага сельсавета. Дыпломам трэцяй ступені адзначаны вучань 9-га класа СШ №2 імя А.К.Флегантава горада Чэрвеня Ілья Мотус (кіраўнік — Таццяна Аляшкевіч), які прывёў малавядомыя факты Ржэўскай бітвы. З працай «Застаюцца ў сэрцах імёны» на канферэнцыі выступіла таксама вучаніца 10-га класа СШ №3 Чэрвеня Вераніка Прышывалка (кіраўнік — Наталля Салычава).

**Святлана АДАМОВІЧ.**